яние отчаяния и одиночества, бессмысленности их существования с предрешенным для них конечным исходом.

В сложившейся ситуации единственно верным решением экзистенциальных проблем личности может быть приобщение ее деятельности к материальным и духовным ценностям в аспекте не только их присвоения (приватизации), но и создания новых инновационных форм. В центре решения всех проблем — экономических, социально-политических и духовного развития, должен находиться человек. Реализация его многообразных потребностей и интересов — это не только путь преодоления экзистенциального страха, но и важное средство осуществления экономических реформ.

ЛИТЕРАТУРА

1. *Платон.* Диалоги. М., 1986. С.245.
2. *Локк.* Диалоги. М., 1985. Т.1. С.282.
3. *Гегель.* Философия религии. М., 1977. Т.1. С.433.
4. *Моссо А.* Страх: психофизиологический этюд /Пер. с фр. С.З.Поновой. СПб., 1887. С.178.
5. Там же. С.180.
6. *Харин Ю.А.* Экзистенциалы человеческих действий // Девятые межкафедральные чтения "Великие преобразователи естествознания: А.Л.Чижевский". Мн., 1992. С.10—11.
7. Творения Иоанна Златоуста. СПб., 1899. Т.2. Кн.1. С.171.
8. *Бэкон Ф.* Сочинения. М., 1978. Т.2. С.251.
9. *Фромм Э.* Бегство от свободы. М., 1990. С.215—217.

І.М. БРАІМ

# *ПРАФСАЮЗЫ: ПОШУКІ АЛЬТЭРНАТЫЎ*

Прафсаюзы ўзніклі ў XVIII ст. у Вялікабрытаніі, Францыі і ЗША з мэтай абароны інтарэсаў працоўных ў іх узаемаадносінах з работадаўцамі. На Беларусі ж прафсаюзны рух развіваўся ў цеснай сувязі з прафсаюзным рухам Расіі. Час нараджэння яго адносіцца да пачатку XX ст. Прафсаюзныя аб'яднанні Беларусі з першых гадоў сваёй дзейнасці ставілі перад сабой наступныя задачы: павышэнне заработнай платы работнікаў, устанаўленне 8-гадзіннага рабочага дня, адмена штрафаў, арганізацыю святкавання дня салідарнасці працоўных 1 мая. Тыя прафсаюзы, якія знаходзіліся пад уплывам бальшавікоў, уключаліся і ў рэвалюцыйную барацьбу, што выклікала рэпрэсіўныя меры супраць іх з боку царскай улады, якая часам прыбягала да іх закрыцця.

У савецкі час прафсаюзы цалкам падпарадкоўваліся камуністычнай партыі і дзейнічалі, як правіла, у згодзе з адміністрацыяй прадпрыемстваў і ўстаноў. Лічылася, што яны з'яўляліся прыводнымі рамянямі ад партыі да народа, школай камунізму для працоўных. У палітычнай сістэме ім адводзілася пэўная роля ў вырашэнні некаторых пытанняў развіцця вытворчасці, удасканалення ўмоў працы, быту, сацыяльнага страхавання, развіцця сацыялістычнага спаборніцтва, рацыяналізатарства і вынаходніцтва, фізічнай культуры, спорту, мастацкай самадзейнасці, санатор-

Іван Мікалаевіч Браім, дацэнт кафедры паліталогіі БДЭУ.

на-курортнага адпачынку. Але здзейснівалася гэта ў тых межах, якія вызначаліся партыяй і дзяржавай. Супярэчыць партыйным сакратарам і дырэктарам у справе абароны інтарэсаў працоўных было не прынята, ды і не рэальна, таму што кіраўніцтва прафсаюзаў выбіралася са згоды парткомаў і кіраўніцтва прадпрыемстваў, арганізацый і устаноў.

У сучасным прафсаюзным руху Беларусі праходзяць неадназначныя і складаныя працэсы, узнікаюць прафесіянальныя саюзы, альтэрнатыўныя традыцыйным савецкім, абвастраецца іх барацьба за ўплыў у працоўных масах, супрацьстаянне прафсаюзаў і адміністрацый прадпрыемстваў і ўстаноў, прафсаюзаў і ўрада рэспублікі.

Зараз ў прафсаюзны рух Беларусі ўваходзяць традыцыйныя, ці, як іх яшчэ называюць, "афіцыйныя" прафсаюзы, незалежныя прафсаюзы, свабодныя прафсаюзы, Канфедэрацыя працы, Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў, некаторыя самастойныя галіновыя прафсаюзы і прафсаюзы асобных фірмаў.

Безумоўна, на сённяшні дзень самым магутным прафсаюзным аб'яднаннем па-ранейшаму з'яўляецца традыцыйны прафсаюз, які зараз выступае пад назвай Федэрацыя прафесіянальных саюзаў Беларусі (ФПБ). У 1993 г. ён налічваў ў сваіх радах 5,3 млн чалавек. Членамі гэтых прафсаюзаў з'яўляліся 98,6 % работнікаў, 96,7 % студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў, сярэдніх спецыяльных устаноў і прафесіянальна-тэхнічных вучылішч. Газета прафсаюза — "Беларускі час".

Федэрацыя прафесіянальных саюзаў Беларусі была ўтворана на XVII з'ездзе савецкіх прафсаюзаў рэспублікі, які адбыўся 4—6 кастрычніка 1990 г. Як было заяўлена ў дэкларацыі аб стварэнні ФПБ, цяпер прафсаюзы ўжо незалежныя ад палітычных партый, дзяржаўных і адміністрацыйных органаў, іншых грамадскіх арганізацый і рухаў і будуць прытрымлівацца толькі законаў, якія дзейнічаюць у рэспубліцы, паважаючы пры гэтым правы, прынцыпы гуманізму і дэмакратыі,замацаваныя ва Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, канвенцыях Міжнароднай арганізацыі працы. Федэрацыя будзе рашуча адстойваць канцэпцыю прафсаюза па стварэнні надзейнай сацыяльнай абароны і падтрымкі насельніцтва ва ўмовах пераходу эканомікі да рыначных адносін, актыўна садзейнічаць зацвярджэнню сацыяльнай справядлівасці. Дзеля гэтага яна будзе шырока выкарыстоўваць права заканадаўчай ініцыятывы ў вышэйшых органах улады, кантролю за выкананнем законаў.

Праграмныя ўстаноўкі ФПБ накіраваны на абарону сацыяльна-эканамічных і законных інтарэсаў працоўных, стварэнне ўмоў для высокапрадукцыйнай працы і справядліва гарантаванай яе аплаты, павышэнне ўзроўню жыцця працоўных, забеспячэнне максімальнай занятасці насельніцтва, прытрымліванне працоўнага і жыллёвага заканадаўства, пераадоленне вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, ахову прыроды, здароў'я і навакольнага асяроддзя, развіццё культуры, фізкультуры, работу з ветэранамі, моладдзю і дзецьмі.

Трэба адзначыць, што ў апошні час традыцыйныя прафсаюзы актывізавалі сваю палітычную і сацыяльную дзейнасць, сталі больш рашуча выступаць супраць урада і іншых адміністрацыйных органаў, якія імкнуцца вырашыць эканамічныя праблемы за кошт абмежавання сацыяльных магчымасцей працоўных і зніжэння ўзроўню іх дабрабыту. У арсенале спосабаў удзеяння прафсаюзных арганізацый з'явіліся такія традыцыйныя для сусветнага прафсаюзнага руху сродкі, як мітынгі пратэсту, забастоўкі. Справа дайшла да таго, што прафсаюзныя лідэры высоўваюць часам такія патрабаванні, якія перавышаюць рэальныя магчымасці дзяржаўных органаў.

Павышэнне сацыяльна-палітычнай актыўнасці афіцыйных прафсаю-

заў абумоўлена тым, што ў іх з'явіліся канкурэнты: свабодныя і незалежныя прафсаюзы. Да таго ж ФПБ стала губляць асноўны эканамічны сродак уздзеяння, якім яна карысталася ў адносінах да сваіх членаў, — фонд сацыяльнай дапамогі. Гэты фонд пераходзіць пад апеку дзяржавы, што не толькі звужае эканамічныя магчымасці традыцыйных прафсаюзаў, але і стварае пагрозу змяншэння іх сацыяльнай базы. Хаця і не вельмі значным, але ўсё ж знамянальным паказчыкам змен у паводзінах бюракратычнай прафсаюзнай вярхушкі з'яўляецца публічны адказ лідэра ФПБ В.Ганчарыка ад прапанаванай урадам персанальнай ільготнай пенсіі. Такія пенсіі ўстанавілі сабе ўрадавыя чыноўнікі і дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь "За асаблівыя заслугі перад Рэспублікай Беларусь" у абход Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 красавіка 1992 г. "Аб пенсійным забеспячэнні".

Адзін з першых альтэрнатыўных прафсаюзаў на Беларусі — Незалежны прафсаюз гарнякоў. Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь зарэгістравала яго ў 1991 г. У 1993 г. ён быў пераўтвораны ў Беларускі незалежны прафсаюз гарнякоў, хімікаў, нафтаперапрацоўшчыкаў, энергетыкаў, транспартнікаў, будаўнікоў і іншых работнікаў (БНП). Зараз гэтае аб'яднанне налічвае ў сваіх радах каля 10 тыс. членаў. Друкаваны орган незалежнага прафсаюза — газета "Солидарность". Цэнтр БНП — у г. Салігорску.

У 1992 г. быў створаны Свабодны прафсаюз Беларусі (СПБ) з цэнтрам у сталіцы рэспублікі г. Мінску. У мінулым годзе ён аб'ядноўваў каля 10 тыс. чалавек. Зараз гэты прафсаюз, хаця і невялікімі тэмпамі, але ж расце. Утвараюцца яго рэгіянальныя арганізацыі. Прафсаюз выдае газету пад назвай "Свабодныя прафсаюзы".

Сваю сацыяльную базу шукае яшчэ адзін міжгаліновы прафсаюз — Канфедэрацыя працы Беларусі (КПБ). Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь ён быў зарэгістраваны ў 1991 г. Колькасць членаў гэтага прафсаюза невялікая, але ж ён імкнецца даволі прынцыпова абараняць інтарэсы работнікаў, якія пажадалі ўступіць у яго рады.

Праграмныя ўстаноўкі альтэрнатыўных прафсаюзаў мала чым адрозніваюцца паміж сабой. Іх мэты і задачы вельмі падобны да мэт і задач афіцыйных прафсаюзаў.

Так, напрыклад, галоўнай мэтай стварэння і дзейнасці Свабоднага прафсаюза Беларусі з'яўляецца аб'яднанне намаганняў работнікаў для сумеснай абароны іх правоў і законных інтарэсаў, забеспячэння справядлівай аплаты працы, аховы здароў'я, іншых сацыяльных гарантый.

Асноўныя задачы СПБ:

прадстаўленне і адстойванне інтарэсаў членаў СПБ ў органах дзяржаўнай улады і ўпраўлення;

падрыхтоўка і заключэнне калектыўных дагавораў і пагадненняў па пытаннях ўмоў жыцця і працы членаў СПБ;

прадстаўленне і абарона інтарэсаў членаў СПБ у ходзе прыватызацыі;

здзяйсненне кантролю і нагляду за выкананнем заканадаўства аб працы і ўдзел у яго ўдасканаленні;

аказанне юрыдычнай дапамогі, матэрыяльнай і іншай падтрымкі членам і пярвічным арганізацыям СПБ;

садзейнічанне павышэнню кваліфікацыі і перападрыхтоўцы (ў тым ліку і ў іншых краінах) сваіх членаў, забеспячэнне іх занятасці і абароны правоў часова беспрацоўных членаў прафсаюза;

прыняцце ўдзелу ў арганізацыі і правядзенні масавых мерапрыемстваў па абароне і пашырэнню правоў і законных інтарэсаў членаў СПО;

арганізацыя страхавых і крэдытных фондаў мэтавага прызначэння і іншых фондаў у інтарэсах членаў СПБ.

Для рашэння статутных задач свабодныя прафсаюзы выкарыстоўваюць

розныя метады і сродкі, разглядаючы забастоўку як крайнюю меру ўздзеяння на органы дзяржаўнай улады і ўпраўлення, адміністрацыйна-гаспадарчыя структуры ўсіх узроўняў і формаў уласнасці.

Асноўнае адрозненне статутаў СПБ і БНП ад статута традыцыйнага прафсаюза ў тым, што яго членамі не могуць быць работадаўцы і іншыя асобы, якія здзяйсняюць функцыі найму і звальнення. У склад жа арганізацый Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ўваходзяць як наёмныя работнікі, так і работадаўцы. Да таго ж альтэрнатыўныя прафсаюзы выступаюць за персаніфікацыю фонду сацыяльнага страхавання, гэта значыць, што тыя 6 % ад прыбытку прадпрыемстваў, якія прызначаюцца на сацыяльныя патрэбы работнікаў, павінны ісці не ў "агульны кацёл", а на асабісты рахунак кожнага работніка. На думку кіраўнікоў новых прафсаюзаў, такая мера прывядзе да адраснай накіраванасці і рацыянальнага расходавання гэтага фонду, бо з яго ўжо не будуць аплачвацца амбулаторныя і бальнічныя лісткі непрацаздольнасці "блатным хворым", а сродкі пойдуць на сапраўднае лячэнне. Гэта мера будзе таксама спрыяць павелічэнню турбот аб сваім здароў'і саміх работнікаў. Прыхільнікі калектыўнага расходавання фонду сацыяльнага страхавання — кіраўнікі афіцыйных прафсаюзных арганізацый — пярэчаць персаніфікацыі гэтага фонду, спасылаючыся на тое, што ў такім выпадку работнік не зможа сам аплаціць санаторна-курортнае лячэнне. У сваю чаргу лідэры альтэрнатыўных прафсаюзаў даказваюць, што "персаніфікацыя" дазволіць аплачваць самім хворым сваё лячэнне.

Яшчэ адзін аргумент, якім карыстаюцца кіраўнікі альтэрнатыўных прафсаюзаў: яны заяўляюць, што не толькі збіраюцца заключаць калектыўныя дагаворы з работадаўцамі, чым абмяжоўваецца, на іх думку, дзейнасць афіцыйных прафсаюзаў, але і дабівацца выканання гэтых дагавораў.

Безумоўна, стартавыя колькасныя і матэрыяльныя магчымасці ў канкурэнцыі альтэрнатыўных і афіцыйных прафсаюзаў непараўнальныя. Каля 20 тыс. чалавек членаў, дзесяткі чалавек кіраўнічага апарату, некалькі пакояў, вельмі сціплы грашовы фонд — у першых і мільёны членаў, тысячы апаратных работнікаў і паслугі, агромістыя адміністрацыйныя будынкі, багаты грашовы фонд — у другіх. Але амбіцыі і аптымізм кіраўніцтва новых прафсаюзаў вялікія. Яны вераць у тое, што з актывізацыяй грамадска-палітычнай дзейнасці гэтых прафсаюзаў, згубленне фонду сацыяльнай дапамогі, фонду сацыяльнага страхавання традыцыйнымі прафсаюзамі прывядзе да адтоку членаў ФПБ і да папаўнення радоў незалежных і свабодных прафаб'яднанняў. Да таго ж, у іх ёсць надзея на матэрыяльную дапамогу з боку прафсаюзаў далёкага замежжа, з якімі наладжваецца цесная сувязь.

Трэба зазначыць, што на ўзроўні працоўных калектываў альтэрнатыўныя прафсаюзныя камітэты і іх лідэры вядуць больш рашучую і бескампрамісную барацьбу за інтарэсы членаў прафсаюзаў, чым гэта робяць прафкомы і кіраўнікі афіцыйных прафсаюзаў. У апошні час намецілася збліжэнне і супрацоўніцтва свабоднага і незалежнага прафсаюзаў. Гэта праявілася, у прыватнасці , у тым, што СПБ і БНП увайшлі ў склад Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Беларусі, які адбыўся ў канцы мінулага года. Мэтай гэтага прафаб'яднання з'яўляецца кансалідацыя дзеянняў асобных прафсаюзаў у справе праваабароны, распрацоўкі прапаноў і рэкамендацый па падрыхтоўцы і заключэнню пагадненняў і калектыўных дагавораў, узаемаабмен інфармацыяй, устанаўленне і падтрыманне супрацоўніцтва з міжнародным прафсаюзным рухам.

Адметная рыса сучаснага прафсаюзнага руху на Беларусі — яго палітызацыя. Асабліва яна прыкметная ў дзейнасці альтэрнатыўных прафсаюзаў. Яны ўсё часцей прыбягаюць да заяў і дзеянняў, якія накіраваны

на змену палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы. Так, на пасяджэннях прадстаўнікоў незалежнага і свабоднага прафаб'яднанняў, якія адбыліся паасобку 30 кастрычніка мінулага года, былі прыняты заявы з патрабаваннямі датэрміновага роспуску Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і правядзення выбараў у прадстаўнічыя органы ўлады па новаму дэмакратычнаму закону, які б гарантаваў правы ўсім грамадзянам на выбарах, уключаючы і прамое выбарчае права.

У апошні час намецілася тэндэнцыя да збліжэння як традыцыйных, так і альтэрнатыўных прафсаюзаў з палітычнымі партыямі і грамадскімі рухамі. Так, нядаўна ў адрас Беларускага незалежнага прафсаюза паступіла прапанова аб наладжванні супрацоўніцтва з боку Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Беларускага згуртавання вайскоўцаў. Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі ўжо заключыла пагадненне аб супрацоўніцтве з БСДГ. Гэты ж прафсаюз пачаў блакіравацца па асобных пытаннях эканамічнага і палітычнага жыцця рэспублікі і з іншымі партыямі. Так, у 1993 г. у друку была зроблена сумесная заява ФПБ і Партыі народнай згоды па праблеме раздзяржаўлення і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці. Умацоўваюцца сувязі ФПБ з Саюзам моладзі Беларусі.

Кіраўніцтва традыцыйнага прафсаюза спрабавала наладзіць кантакты з альтэрнатыўнымі прафсаюзамі з мэтай сумеснага адстойвання інтарэсаў працоўных у Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь. Але ж распачатыя спробы безрэзультатыўныя. Наадварот — крытыка ў адрас афіцыйнага прафсаюза з боку альтэрнатыўных прафаб'яднанняў у апошні час узмацнілася і набыла вострыя формы. Так, пры інтэрв'юіраванні аўтарам прэзідэнта Кангрэса дэмакратычных прафсаюзаў Беларусі В.Бадаеда выявілася, што ён наогул не лічыць традыцыйныя прафсаюзныя арганізацыі прафсаюзам у поўным сэнсе слова, як гэта разумеецца ў міжнародным прафсаюзным руху. Ён робіць гэту выснову на падставе таго, што афіцыйныя прафсаюзы аб'ядноўваюць у сваіх радах наёмных работнікаў і работадаўцаў. Да таго ж, як ён сцвярджае, кіраўнікі прадпрыемстваў па-ранейшаму "падкармліваюць" лідэраў афіцыйных прафсаюзаў, што стрымлівае актыўнасць апошніх ў абароне інтарэсаў працоўных і штурхае на кампрамісы з адміністрацыяй. Дарэчы, з-за таго, што па ўставу Канфедэрацыі працы Беларусі членам гэтага прафаб'яднання могуць быць побач з наёмнымі работнікамі і работадаўцы, яно не прымаецца ў Кангрэс дэмакратычных прафсаюзаў.

Заўважым, што падставы для крытыкі з боку альтэрнатыўных прафсаюзаў дае само кіраўніцтва традыцыйных прафсаюзных арганізацый. Гэта нерашучая абарона іх прафкомамі і лідэрамі інтарэсаў членаў прафсаюза, невыкананне прынятых рашэнняў, раздуты кіруючы апарат і яго шматлікая абслуга, асабістае выкарыстанне прафсаюзных сродкаў некаторымі прафсаюзнымі кіраўнікамі, факты недобрасумленных паводзін прафсаюзных кіраўнікоў з адміністрацыяй прадпрыемстваў і рознымі СП. Прыкладам апошняга з'яўляецца здзелка лідэра прафсаюзнага камітэта Мінскага трактарнага завода Ч.Федаровіча з намеснікам генеральнага дырэктара прадпрыемства В.Філіпавым па стварэнню сумеснага прадпрыемства "Місо", якая, акрамя шкоды, не прынесла нічога добрага калектыву, але ж была выгаднай для яго арганізатараў (Звязда. 1993. 11 кастр.).

З'яўленне альтэрнатыўных прафсаюзаў можна лічыць з'явай пазітыўнай. Канкурэнцыя ў справе абароны інтарэсаў наёмных работнікаў можа прынесці ім карысць. Зараз незадаволены дзейнасцю свайго прафсаюза чалавек мае магчымасць перайсці ў больш баявую прафсаюзную арганізацыю. Разам з тым існуе і небяспека, што супрацьстаянне шматлікіх прафсаюзаў можа прывесці да расколу і паслаблення прафсаюзнага руху. Як будуць ісці працэсы ў гэтым накірунку далей, якія будуць іх вынікі, зараз прагназіраваць цяжка. Як гаворыцца, час пакажа.